**Багдановіч, Н.** Ім пашчасціла вярнуцца / Н. Багдановіч // Патрыёт (Ушачы). — 2012. — 15 лют. — С. 1—2.

# ІМ ПАШЧАСЦІЛА ВЯРНУЦЦА




*Яны не любяць успамінаць Афганістан – кажуць, потым некалькі дзён не будзе душы спакою, ніякімі намаганнямі волі не здолееш выгнаць са сноў і думак малюнкі, якія вось, ужо трыццаць годоў захоўваюцца ў складніках памяці, каб раз-пораз усплыць пейзажам горнай цясніны ці вобразам баявога сябра...*

Ва «Ушацкім райаграсэрвісе» іх шасцёра – гэта самая вялікая «суполка» былых афганцаў на прадпрыемствах раёна: малодшыя сяржанты Віктар Прахарэнка і Дзмітрый Кулянок, яфрэйтар Анатоль Жаваранак, радавыя Аляксандр Казьянін і адразу два Мікалаі Саўчанкі – Аляксандравіч і Макаравіч. Зрэшты, распазнаць цёзак можна і без імя па бацьку, бо да Макаравіча яшчэ з тых часоў прымацавалася афганская мянушка.

Яны былі ўчарашнімі школьнікамі, калі трапілі ў пекла, прычым, ва ўсіх сэнсах – бывала, што слупок тэрмометра ўзнімаўся там да +67. «Намочыш прасціну, накрыешся і імкнешся хутчэй заснуць, пакуль яна не высахла», – успамінаюць мае субяседнікі. Але ж, вядома, гэта былі не самыя вялікія выпрабаванні...

Ім давялося ваяваць у розных месцах і родах войск, але ў «афганскім багажы» кожнага – удзел у баявых аперацыях. Шмат іх было ў вадзіцеля баявой машыны дэсанту Аляксандра Казьяніна, але адзін эпізод вылучаецца асобна. Ён атрымаў загад падвезці да нашага гарнізону ваду і прадукты, аднак, па звестках разведкі, дарога да «кропкі», магчыма, была замініравана. Сапёры ў той сітуацыі дапамагчы не маглі, і Аляксандр выехаў у рэйс, кожны метр якога мог стаць для яго апошнім. Калі б разведчыкі не памыліліся, вадзіцель, хутчэй за ўсё, атрымаў бы Зорку Героя. І, хутчэй за ўсё, – пасмяротна... Зрэшты, у паветра ён тады ўсё ж узляцеў: яго падкідвалі на руках узрадаваныя салдаты, якія ўжо некалькі дзён былі без вады...

Смяротная небяспека чакала байцоў на кожным кроку. Віктар Прахарэнка, што служыў у батальёне абслугоўвання трубаправодаў, па якіх вялося перакачванне рэактыўнага паліва, прыгадвае: «Маджахеды наўмысна прабівалі трубу ў чаканні, калі мы пачнём яе рамантаваць, таму рабіць гэта звычайна даводзілася пад прыкрыццем агню БТРаў». Аб'ездзіў уздоўж і папярок увесь Афган са сваёй аўтаротай, якая забяспечвала воінаў боепрыпасамі, харчаваннем і палівам, Мікалай Макаравіч Саўчанка. Даводзілася яму хадзіць і на «прачоскі».

Ахоўваў горныя перавалы вадзіцель БТРа Анатоль Жаваранак. Падчас аднаго з баёў быў паранены, пасля лячэння атрымаў магчымасць паехаць у водпуск на радзіму. Вяртаўся назад сваім ходам: праз Маскву да Душанбе, адтуль да месца службы. І, прынамсі, нават думкі не ўзнікла ў хлопца аб тым, каб нейкім чынам падоўжыць водпуск – «захварэць», раздабыць медыцынскую даведку ці нешта накшталт таго. Такія былі часы, такія стэрэатыпы: цяжка зараз паверыць, але ў 70–80-х тых, хто не прайшоў армейскую службу, лічылі «дэфектыўнымі», асабліва ў вёсцы – маўляў, які ж ён мужчына, калі не ўзялі ў армію?

Але, як зазначае Віктар Прахарэнка, нават не баявыя моманты былі самымі жудаснымі. Тры разы яму даводзілася суправаджаць на радзіму, у Сярэднюю Азію, целы загінуўшых салдат. І зараз стаяць у вачах счарнелыя ад гора твары ўзбекскіх матуль, гучыць у вушах іх нямы дакор: «Чаму ты жывы, а мой сынок – не?!»...

Так, ім пашчасціла. «Назад ехалі – убачылі зеляніну! Адчуванне той эйфарыі не параўнаць ні з чым!» – ледзь не ў адзін голас усклікаюць былыя воіны. А Мікалай Макаравіч Саўчанка прыгадвае, як не пашкадаваў на мінскім вакзале ста рублёў таксісту (на той час за гэтыя грошы можна было адпачыць у Крыме або купіць югаслаўскія зімовыя боты!), які згадзіўся з камфортам даімчаць яго да роднай Ушаччыны на «Жыгулях», як потым два дні гуляла ўсё Урбанова, а ў завячэльскім клубе ў суботу нават не было танцаў – навакольная «тусоўка» разам з музычнай апаратурай перакачавала ў хату да Саўчанкаў...

Звычайнай жыццёвай непрыемнасцю, а зусім не катастрофай, здалося Анатолю Жаваранку замужжа дзяўчыны, якая калісьці абяцала чакаць: жыццё падзялілася на «да» і «пасля», і ў гэтым «пасля» шкала каштоўнасцяў моцна змянілася. Цяпер шчасцем здавалася нават магчымасць проста прайсціся па родных Лажанях, усміхнуцца дзяўчатам, абмяняцца прывітаннем з суседам – і не ўціскаць галаву ў плечы ў пастаянным чаканні, што раптам аднекуль з-за скалы прыляціць куля...

Не ўсе былыя афганцы адолелі гэты пераход: іншыя так і не знайшлі сябе ў мірным жыцці.

Мае ж субяседнікі справіліся. Як адзначае намеснік дырэктара «Райаграсэрвіса» па ідэалагічнай рабоце Святлана Церашкевіч, усе яны – старанныя, адказныя работнікі і сумленныя людзі. Афган наклаў адбітак на іх лёсы і характары: прывіў абвостранае пачуццё справядлівасці і звычку «заводзіцца» з паўабарота, але не з зламаў трывалага ўнутранага стрыжня, не пазбавіў умення шчыра сябраваць, кахаць і радавацца жыццю.

**Н. Багдановіч**